# СЛАЎНАЕ ПЯЦІГОДДЗЕ

(Працяг).

ласа толькі 80 кап. на кожнага навучаючагася. У рэзультаце 75 проц. усяго насельніцтва было непісьменнымі, а сярод жанчын непісьменнасць дасягала 90 проц. У сучасны момант ва ўсходніх абласцях Беларускай ССР у асноўным закончана ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці.

За годы сталінскіх пяцігодак пабудавана больш 565 новых сталінскіх школ, у якіх збучаецца ў чатыры разы больш вучняў, чым у 1914—1915 гг.

За апошнія годы ў народнай асвеце адбыліся глыбокія якасныя зрухі. Яны ідуць па лініі бурнага росту сярэдняй асветы, што ў сваю чаргу азначае пад'ём культуры працоўных Беларускай ССР. Наколькі вялік размах сярэдняй школы ў БССР за апошнія годы, гавораць наступныя даныя: у 1932—1933 гг. у Беларусі было 30 поўных сярэдніх школ, а ўжо ў 1937—1938 вучэбным годзе лік поўных сярэдніх школ узрос да 409 — рост у 13 разоў. У 8—10 класах у 1932—33 гг. абучалася 700 чалавек, а ў 1937—1938 вучэбным годзе ў гэтых класах ужо было 35,2 тыс. чалавек — рост у 50,3 раза.

Да Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі ў Беларусі была толькі 1 вышэйшая навучальная ўстанова, а зараз ёсць 22 вышэйшых навучальных установы, 41 навукова-даследчая ўстанова.

Бурны рост сеткі школ як агульнаадукацыйных, так і спецыяльных, вышэйшых навучальных устаноў забяспечыў насычанасць народнай гаспадаркі Беларускай ССР кваліфікаванымі кадрамі. На 1 студзеня 1939 г. у Беларусі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі налічвалася звыш 13 тыс. спецыялістаў з вышэйшай асветай: інжынераў, педагогаў, аграномаў, урачоў, эканамістаў і другіх спецыяльнасцей. Асабліва выраслі кадры педагогаў і ўрачоў. У 1932 г. на 100 тыс. насельніцтва прыходзілася 32 урачы і 415 настаўнікаў. На пачатак 1939 года на 100 тыс. насельніцтва прыходзіцца 47 урачоў і 604 настаўнікі.

Вырасла тэатральная культура беларускага народа. У сучасны момант працуе 16 тэатраў, філармонія, кансерваторыя і цэлы рад тэатральных, музыкальных навучальных устаноў. Ярка расцвіла народная творчасць беларускага народа, якая з'яўляецца той крыніцай, з якой чэрпае свае сілы прафесіянальны тэатр. Беларуская ССР не мала вырасціла сваіх вучоных, артыстаў, мастакоў, пісьменнікаў і паэтаў.

Работнікі мастацтваў Беларускай ССР скора пакажуць свае дасягненні на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

Наша партыя, наш урад, няўхільна ажыццяўляючы палітыку міру, забяспечылі працоўным мірную працу і няспынны рост развіцця ўнутраных сіл нашай дзяржавы.

З'еднаны вялікі беларускі народ пад кіраўніцтвам нашай партыі і правадыра працоўных усяго свету таварыша Сталіна з нябачаным уздымам прыступіў да вялікіх работ 1940 года, да выканання задач, пастаўленых трэцім пяцігадовым планам.

У трэцім пяцігоддзі перад БССР, як адной з рэспублік Савецкага Саюза, пастаўлены задачы, выцякаючыя з далейшай пабудовы комуністычнага грамадства, магутнага росквіту прадукцыйнасці працы, умацавання абароны і значнага паляпшэння матэрыяльнага і культурнага ўзроўню працоўных.

Адной з асноўных задач развіцця народнай гаспадаркі ў трэцяй пяцігодцы з'яўляецца правільнае размяшчэнне прадукцыйных сіл у рэспубліцы з пункту погляду набліжэння прадпрыемстваў да крыніц сыравіны і спажывання, максімальнае аслабаненне рэспублікі ад дальніх перавозак на аснове найбольшага і комплекснага асваення мясцовых відаў сыравіны і матэрыялаў.

Прыродныя багацці БССР надзвычай вялікія. Магутныя залежы торфа, багацце сыравінных рэсурсаў, будаўнічых матэрыялаў, вялікія запасы фасфарытаў, кварцавых пяскоў, крэйды і вапнякоў — усё гэта дазваляе шырока разгарнуць прамысловасць на мясцовай сыравіне.

У галіне развіцця мясцовай прамысловасці ў трэцім пяцігоддзі асаблівая ўвага надаецца пашырэнню вытворчасці мясцовых будаўнічых матэрыялаў, у прыватнасці вытворчасці цэмента, чарапіцы, цэглы.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы